

Інфармацыйная культурна-грамадская газета Гарадоччыны

ГАСЦІНЕЦ

№ 12 (255) ЖНІВЕНЬ 2018 ГОДА

БЕЛАРУСКІ АФАРЫЗМ

Багаты духам той, хто дарыць многа, убогі – хто не дорыць, а бярэ

Алесь Звонак

ФІНАНСАВЫЯ ПАКАЗЧЫКІ

ІСТОТНАЕ АЗДАРАЎЛЕННЕ ЭКАНОМІКІ

Нацыянальны статыстычны камітэт апублікаваў статыстычныя паказчыкі асноўнага развіцця Гарадоцкага раёна за шэсць месяцаў 2018 года. Афіцыйныя фінансавыя паказчыкі за першае паўгоддзе сведчаць пра фінасавае аздараўленне эканомікі раёна.

У раздзеле «Фінансы» Нацстаткамітэта http://www.belstat.gov.by для развіцця раёнаў унесена сем паказчыкаў. Дык у Гарадоцкага раёна пазітыўная дынаміка назіраецца па сямі паказчыках. Так чысты прыбытак у параўнанні з 2017 года за шэсць месяцаў павялічыўся з 1 122 тыс. руб . да 2 871 тыс. руб. Нагадаю, што на канец 2015 года раён нёс страты ў памеры — 13 454 тыс. рублёў.

Зразумела, што ў пэўнай ступені гэты прагрэс ёсць вынік палітыкі на ліквідацыю стратных прадпрыемстваў. Нагадаем, што за гэты час фактычна зніклі ўсе стратныя калгасы-саўгасы: РАПС, льназавод, "Сцяпанавічы, Дзімітрава. А застаўся толькі былы саўгас імя Свердлава, які таксама шчэ, як кажуць, у даўгах, як у шаўках. Пры гэтым ратаванне патапельцаў найперш ёсць справа саміх патапельцаў. Гэта адносна тых работнікаў былых стратных арганізацый, якіх не стала.

Пасля ліквідацыі стратных прадпрыемстваў сталі памяншацца пратэрмінаваныя запазычанасці па раёну. За год дэбіторская запазычанасць зменшылася з 4 866 тыс. руб. да 2 733 — 78%, пратэрмінаваная крэдзіторская запазычанасць з 57 522 тыс. руб. да 31953 тыс. руб. — 80%.

Пры гэтым крэдыторсія запазычанасці за паліўна-энергетычныя рэсурсы зменшыліся з 5 113 тыс. руб да 2 350 тыс. руб., па падатках і зборах, сацыяльнаму страхаванню з 1 486 тыс. руб. да 532 тыс. руб.

З фінансавых паказчыкаў няма пазітыўнай дынамікі толькі па рэнтабельнасці прадаж, бо ў мінулым годзе яна склала 6,3% за першыя шэсць месяцаў, а ў гэтым годзе толькі 2,5%. І гэта зразумела, бо за год рэзка павялічыліся запасы гатовай прадукцыі на складах у % да сярэднемесячнай вытворчасці. Калі ў 2017 годзе гэты паказчык быў 69,4%, то ў гэтым годзе за гэты ж перыяд — 111,5%.

Відавочна, што неабходна шмат працы, каб выйсці на эфектыўную эканоміку Гарадоцкага раёна, ў якім усё менш людзей занята ў эканоміцы: было ў 2017 годзе — 8974 чалавека, а на сёняшні справаздачны час — 8 664.

Леанід Гаравы

ЖНІВО-2018

2000 ТОНН РЕКОРДА

На Городоччине впервые в истории поздравили экипаж намолотивший 2000 тонн зерна.

Это событие в истории района совершил уборочный экипаж в составе комбайнера Колпакова Александра Михайловича и его помощника Кандыбайло Ивана Алексеевича, направленных в УП «Северный» из ОАО «Витебский мясокомбинат». Данный двухтысячный рубеж оказался сейчас третьим результатом в Витебской области.

Молодежь также не отстает в своих достижениях. Первым в Городокском районе тысячу тонн зерна перевёз на автомобиле МАЗ-551605 Савельев Сергей Викторович, молодой водитель УП «Северный».

В чествовании лидеров приняли участие председатель районного комитета работников профсоюза АПК Т.Л. Груганова, председатель районного объединения профсоюзов И.А.Дорощенко, руководство предприятия УП «Северный» и представитель ОАО «Витебский мясокомбинат». Механизаторам были вручены почетные грамоты, подарки, цветы и денежные премии. Традиционно автоклуб порадовал передовиков уборочной музыкальным поздравлением.

По информации: https://vk.com/public165111063

АЎТАСЭРВІС

У ВІЦЕБСК ХУТЧЭЙ І ТАННЕЙ

На маршруце «Гарадок — Віцебск» уведзены хуткасныя рэйсы без прыпынкаў.

З 27 ліпеня з аўтастанцыі г. Гарадка пачалі ажыццяўляцца рэйсы без прыпынкаў па трасе ў Віцебск. Гэтыя рэйсы ажыццяўляюцца з аўтастанцыі Гарадка штодзённа ў 7.40; 11.00; 13.45; 15.50; 17.50, а акрамя суботы і нядзелі шчэ ажыццяўляецца рэйс на 19.40.

І пры гэтым кошт білетаў на гэтыя рэйсы істотна знішан і каштуе 2, 00 рубля. Відавочна, што гэта неабходны крок дзяржаўнага прадпрыемства ў змаганні з прыватнымі таксоўшчыкамі, якія трымаюць кошт у 3 рублі за паездку ў Віцебск.

Адначасова з гэтым на аўтастанцыі распачаўся гандаль марозівам і халоднымі напоямі, што таксама сведчыць аб павелічэнні ўвагі да культуры абслугоўвання пасажыраў. Ды і наведвальнікі і работнікі мясцовага кірмаша могуць карыстацца паслугамі гэтай гандлёвай кропкі на аўтастанцыі.

Л. Антонаў

ЗНАЧНА БОЛЬШ НАВІНАЎ ПРА ГАРАДОК НА HARADOK.INFO

БІЯТЛОН

«Я ДОГАДЫВАЛАСЬ, ЧТО МЕНЯ НЕ ПРИГЛАСЯТ В СБОРНУЮ...”

Белорусская биатлонистка Анастасия Киннунен (Дуборезова), остро отреагировавшая на одну из недавних статей в белорусской прессе, пообщалась с корреспондентом Pressball.by и расставила все точки над «i» в формате более широком, чем инстаграм.

…Посыл того материала заключался в том, что вы фактически бросили команду в разгар подготовки к Олимпиаде. Это про то, что позволили себе забеременеть. Но ведь не было никакого разгара, это был еще 2016 год.

Конечно, это не был разгар непосредственной подготовки к Пхенчхану, но это был декабрь, разгар сезона-2016/17. Никто не ожидал такого, и, прежде всего, я. Не знаю, понимает ли это Васильев, но с замужними женщинами такое иногда случается. Это жизнь, это женское счастье, и сейчас я очень рада, что все так сложилось.

Но, повторюсь, на тот момент это стало сюрпризом и для меня, и для тренерского штаба. Я прошла всю межсезонку, переварила огромные нагрузки, была неплохо готова, а тут вдруг все меняется. Съездила к врачам, они все подтвердили и сказали, что беременность протекает нормально…

Было ли тогда, зимой 2016 года ощущение, что с уходом в декретный отпуск подставляете команду?

У меня было беспокойство, как команда будет без меня, но на тот момент я сама была в растерянности. Когда я проконсультировалась с финскими врачами, они однозначно советовали не сбрасывать резко нагрузки, не менять резко род деятельности. Это могло бы навредить плоду. Раз биатлонистка, продолжай тренироваться пока еще у тебя ранняя стадия беременности. И я прислушалась. Благо, в европейском биатлоне были и есть случаи, когда беременные спортсмени продолжали тренироваться и даже выступать. Естественно, объемы были щадящие, но я даже планировала участвовать в соревнованиях. Но белорусское законодательство не разрешает физическую нагрузку беременным, врачи команды не давали мне добро. Я даже на сборе вместе с девчонками не могла находиться.

Как мне было разговаривать с людьми? Ссылаться на финнов? Но наши придерживались белорусских законов. Даже холостой тренаж считается физической нагрузкой. В итоге я покинула Беларусь, приехала в Финляндию и стала здесь тренироваться самостоятельно под контролем врача…

Расскажите, как происходила попытка вашего возвращения в команду после родов? Дочку вы родили в августе 2017 года.

Да, все верно. А по поводу возвращения... Я в декрете-то практически не была. Мой декрет — это две недели родовой деятельности. Больница, роды, возвращение домой. А до этого и после этого — дозированная физическая нагрузка. Так что я была в порядке после рождения дочки. Когда врач разрешил, я просто увеличила объем физической нагрузки.

Чувствовала себя замечательно, хотела снова вернуться в биатлонную круговерть. Знала ситуацию с белорусской командой, знала, что девчонкам непросто в олимпийском сезоне — у нас ведь нет длинной скамейки запасных. Поэтому полагала, что моя помощь придется ко двору. Когда дочке исполнился месяц, я отправилась в Беларусь и рассказала федерации, что хочу вернуться и помочь. Естественно, сразу на Кубок мира я не нацеливалась, рассчитывала на заявку в Кубок ИБУ, где есть свободные квоты.

(працяг на стар. 2)

Аб’ява

Аператыўная інфармацыя аб падзеях Гарадоччыны, рэгіёна і больш, чым у газеце, зараз па-беларуску і па-расейску з’яўляецца на новым Інтэрнэт рэсурсе: http://haradok.info

****

Наша газета “Гасцінец” пачала размешчацца на партале http://haradok.info ў раздзеле “Газета “Гасцінец”, дзе ствараецца архіў за мінулыя гады.

****

Каб атрымліваць кожны нумар газеты «Гасцінец» паведаміце рэдакцыі аб гэтым – і вы яго атрымаеце. Калі ўжо не жадаеце атрымліваць выданне, то патэлефануйце у рэдакцыю.

БІЯТЛОН

(пачатак на стар. №1)

Более того, я не просила у БФБ финансирования, понимала, что мне нужно ехать за свой счет, поскольку никто не мог предполагать, в какой форме нахожусь.

Мне сказали — «окей», езжай пока за свои, а если выполняешь критерии отбора, дальше поедешь на этапы Кубка ИБУ за средства федерации. В первой гонке в январе я была 22-й в спринте, то есть, условия квалификации были сразу выполнены, но продолжения не последовало…

На ваш взгляд, почему в новом сезоне, после ухода Дарьи Домрачевой и Надежды Скардино, при очевидном кадровом дефиците в национальной команде белорусская сторона даже не сделала вам предложения вернуться и помочь команде, состоящей ныне всего из 4 человек? В сборную даже Дарью Юркевич рекрутировали, которая собиралась заканчивать карьеру.

Я догадывалась, что даже в пиковой ситуации ко мне не обратятся. Все началось в 2016 году, когда мы с нынешним руководителем федерации не смогли найти общий язык…

Помню, в какую жесткую оппозицию по этому вопросу ушла Надежда Скардино, также отказавшая в доверии новому тренеру.Скандал в итоге донесся до столичных министерских кабинетов, в команде наметилось противостояние, закончившееся общим собранием — последним для Королькевича. После чемпионата мира-2016 в Холменколлене его уже не было в команде.

Все верно, но я в данном случае говорю только за себя. Я смирилась, начала работать под его началом, но тут начались интриги. Физическое состояние было неконкурентоспособным, даже при четырех нулях на рубеже я не могла бежать.

Прихожу к главному тренеру, спрашиваю Андриана Алексеевича — а что вообще происходит, что делать будем? Но на такие вопросы никто ответа не давал. А когда нет обратной связи и понимания происходящего, противоречия накапливались снежным комом, нервы у людей не выдерживали. Нас ведь кормили обещаниями, что вся подготовка заточена на пик формы именно к чемпионату мира, уж там-то мы понесемся. В итоге ни один человек в сборной на этот пик не вышел, Холменколлен остался для сборной безмедальным.

Именно поэтому не удивилась своему неприглашению в сборную даже в условиях кадрового голода. При нынешней ситуации, когда в команду снова вернулся Владимир Борисович, при нынешнем руководстве БФБ шансов на возвращение у меня нет никаких. А ведь Андриан Цыбульский сам брал меня в биатлон, я ему по гроб жизни благодарна за то, что он меня всему научил в этом виде спорта. Тогда я была, по его мнению, перспективная спортсменка, но после скандала с Королькевичем сразу стала бесперспективной. И, наверное, строптивой, позволившей себе высказывать собственное мнение….

Вы говорите, что в Финляндии нет централизованной подготовки и существенной господдержки. А как тогда организует свою подготовку Кайса?

Она всеми вопросами занимается самостоятельно на деньги многочисленных рекламных спонсоров. Она не только элитная биатлонистка, она еще администратор элитной биатлонистки Кайсы Мякяряйнен, организатор ее команды. От государства там совсем небольшой процент финансирования. Чем больше контрактов ты заключишь со спонсорами, тем больше у тебя будет бюджет на сезон.

Здесь сразу вспоминается Беларусь. Государство уделяет спорту огромное внимание, помогает большими деньгами, но в то же время налагает на тебя громадную ответственность. Точнее, даже не государство давит, а отдельная прослойка государственных чиновников от спорта. Ты прямо кожей чувствуешь это бремя ответственности, этот девиз — «отработай государственные деньги, оправдай бюджетные траты». А если медальной отдачи не будет, то скажут, что растранжирила народные средства.

Вы уже полностью обустроились в Финляндии?

Да, можно так сказать. У нас свой дом, рядом с лесом, через который проходит обустроенная трасса. И я могу сразу выходить на тренировки. Если что, могу выехать в Контиолахти, поработать в условиях крупного биатлонного центра. Это недалеко. Стараюсь не злоупотреблять ездой на машине, все больше на лыжероллерах и велосипеде передвигаюсь по отличным дорожкам.

…У нас была отличная сборная, тонко и точно настроенная, работавшая как часы. И в этом большая заслуга тогдашнего главного тренера Андриана Цыбульского и всего коллектива команды. Со своей стороны хочу пожелать новому составу «националки», тренерскому штабу, федерации выстоять в этой непростой ситуации и сохранить высокое реноме белорусского биатлона. Желаю парням и девчонкам удачи, буду за них болеть.

Сергей ВЕРСОЦКИЙ
https://www.pressball.by

КУБАК ХМЕЛЯ

ЛИШИЛИСЬ ПО ПЕНАЛЬТИ ТРЕТЬЕГО МЕСТА

Второй день Кубка Хмеля по традиции состоит из игр на выбывание. В четвертьфинале с ФК «Хмель» наша команда быстро пропустила мяч от земляка Дмитрия Шило после его слаломного прохода к нашим воротам. Но вскоре игра у нас наладилась и команда сначала сравняла счёт, а к концу первого периода (игра в плэй-офф состоит из двух таймов) Олег Слаутин мастерски отобрал у соперника мяч на его половине и между ног прострелил и защитника и вратаря, доведя счет до 3:1 в нашу пользу. Во втором же тайме наше преимущество выросло до крупного счета 6:1.

В полуфинале соперником городокского клуба стал минский клуб Art-Stars, укомплектованный молодыми игроками. С самого начала игра у нас не заладилась возможно по психологическим причинам ибо Art-Stars вольготно проходил к нашим воротам и дважды их расстреливал в упор. Но наша команда сумела собраться, добавить скорости и в первом тайме сократила счет, а во втором сравняла. Потом были удары в штангу, перекладину по минским воротам, но судьбу матча решили пенальти. Наш футболист первый мяч направил выше ворот, а столичные футболисты предоставленным шансом воспользовались. Можно сказать, что мы проявили гостеприимство перед звездами белорусской эстрады.

В матче за третье место мы вновь догоняли команду ИнструментКомлект с Борисова, во втором тайме прижали их к воротам, но точности в завершении атаки не хватало ни Олегу Слаутину, ни Денису Фадееву и т.д., а несколько раз гостей выручала перекладина и штанга после сокрушительных ударов. А в послематчевых пенальти повторилась ситуации полуфинала — один наш промах и безукоризненное выполнение пенальти гостями из Борисова.

Финальный матч между Art-Stars и «КалинПродукт» из Новолукомля прошел в упорной борьбе, но с заметным преимуществом более профессиональных футболистом с Витебщины, многие из которых играют в чемпионате страны по мини-футболу. Финальный свисток зафиксировал счет — 3:1 в пользу новолукомльской команды.

А по итогам турнира организаторы по традиции наладили обширное чествование и помощников по работе (призы получили и заведующий сектором спорта и туризма Городокского райсиполкома Юлия Короткова вместе с инспектором Татьяной Кондратьевой), лучшие игроки каждой команды, а также по линиям игры — лучший бомбардир турнира — Олег Слаутин из Городка.

Также много призов собрала и минская команда Art-Stars во главе с её бессменным руководителем Альбертом Скороходом. Кстати в следующем году у этой команды юбилей — 25 лет со дня основания.

И по традиции на память было общее фото участников и организаторов турнира на Кубок Хмеля.

До новой встречи в 2019 году, Кубок Хмеля.

Леонид Горовой

ЗДАРЭННЕ

ХУЛІГАНЫ І ДАЛЕЙ ЗНІШЧАЮЦЬ КРЭСЛЫ

У Гарадку на гарадскім стадыёне хуліганы працягваюць знішчаць крэслы для гледачоў.

Напрыканцы ліпеня на гарадскім стадыёне было выяўлена чарговае знішчэнне 12 крэслаў для гледачоў на левай трыбуне. Нанесеная шкода ацэньваецца каля 100 рублёў, але значна большая маральная шкода ў чарговы раз нанесена аматарам спорту ў Гарадку.

Нагадаем, што новая сучасная трыбуна на гарадскім стадыёне па вул. Невельская шаша была абсталявана ў 2014 годзе , калі ў Гарадку рыхтаваліся да абласнога свята працаўнікоў вёскі «Дажынкі — 2014». На яе левай і правай частках на металічным каркасе было зманціравана 300 пластыкавых крэслаў. Гэтыя крэслы замянілі ранейшыя драўляныя лавы, што былі на бетоннай трыбуне.

Але мусіць з самых першых месяцаў існавання новай трыбуны, яна стала «культавым» месцам для аматараў Бахуса ў цёплы час года. Пераважна па выхадных або пасля працы групы грамадзян пачынаюць распіваць на трыбуне моцныя напоі. І не заўжды гэта толькі піва з «таранькай».

А пад час распіцця алкаголя тутэйшыя «адпачываючыя» пачынаць нагамі ламаць спінкі крэслаў. У выніку падобных хуліганскіх дзеяў на стадыёне засталося толькі каля 230 крэслаў. І ужо трэць левай трыбуны засталася вольнай ад крэслаў.

Праваахоўчыя органы за гэтыя амаль чатыры гады неадночы ўзбуджалі справы па знішчэнню дзяржаўнай маёмасці, але хуліганскія дзеянні на стадыёне працягваюцца. Мусіць і гэтым разам будзе чарговая справа, бо шкода ад сапсавання 12 крэслаў складае амаль 100 рублёў. А на іх месца пастаўлены цэлыя крэслы з края трыбуны.

Толькі завядзеннем справы спынення вандалізму на стадыёне не будзе. Варта дружыннікам, якія ёсць у арганізацыях горада, патруліраваць ваколіцы стадыёна і спрыяць прыцягненню да адказнасці аматараў Бахуса. Боператварэнне стадыёна ў пляцоўку для распіцця алкагольных напояў ёсць антыграмадскае дзеянне, якое цягнене прававу адказнасць.

І безумоўна ўладальніку стадыёна неабходна як мага хутчэй абсталяваць трыбуны стадыёна камерамі відэаназірання, выдаткаваўшы на гэта каля 600 рублёў.

Л. Антонаў
паводле: http://haradok-tour.by

АДПАЧЫНАК

ПРАЙШОЎ ЧАРГОВЫ ФЭСТ ФАРБАЎ

19 жніўня ў нядзелю ў Гарадку ў дзіцячым парку адбыўся чарговы Фэст Фарбаў, а таксама ўпершыню прадэманстравана магчымасць гульні ў бампербол.

Самым вясёлым месцам тыдня мусіць стаў Дзіцячы парк Гарадка, дзе група БэлХолі арганізавала Фэст Фарбаў. Асноўнае дзейства мерапрыемства адбывалася пад кіраўніцтвам Дыджэя. Дыджэй кіраваў юнымі аматарамі фарбаў, якія танчылі пад хуткую музыку і час ад часу абкідвалі суседзяў фарбамі рознага колеру.

Гэты адпачынак з фарбамі набыў сваіх прыхільнікаў у розных гарадах Беларусі. Так тыднем раней Фэст быў у Бешанковічах, а 1 верасня будзе ў Шуміліна. Ды й у Гарадку ён праходзіў ужо ў трэцці раз.

Гульні з фарбамі і дыскатэка не адзіная фішка мерапрыемства. Пад час фэста ў дзіцячым парку магчыма было набыць розныя цацкі, нанесці малюнак на твар у тэхніцы аква-грым, паскакаць на батуце.

Адной з фішак свята стала гульня ў бампербол. Па асноўных правілах гэтай гульні трэба ўтрымацца на нагах пры судакрананнях з сапернікам. І самы надзейны прыём для перамогі — адвярнуцца ад удара, бо тады сапернік каціцца на зямлю ў празрыстым шары.

Гэтае свята не стасуецца са сціплымі стандартамі савецкіх святаў, але відавочна прыйшлося да душы маладым жыхарам Гарадка. А каб быць актыўным удзельнікам Фэста трэба набыць пакунак фарбы за 5 рублёў і весяліся пад музыку ад Дыджэя...

Л. Антонаў

АЗБУКА ПАЛІТАЛОГІІ

«ЖЭСТАЧАЙШАЕ ЎЖЭСТАЧЭННЕ»

Другая палова 2017 года прайшла ў Беларусі пад знакам разняволення дзелавой ініцыятывы. У поўнай адпаведнасці з даўно ўсталяванай адміністрацыйнай традыцыяй, добрыя намеры былі афармленыя ў выглядзе пакета дакументаў — двух дэкрэтаў і сямі ўказаў адзінага палітыка (АП).



На двары жнівень. Самы час падвесці першыя вынікі разняволення, але арганізатары кампаніі рабіць гэта не спяшаюцца. Зразумець іх нескладана. Не да таго ім цяпер. Яны занятыя распрацоўкай чарговых дэкрэтаў і ўказаў. Больш адказнай працы ў рамках беларускай мадэлі няма, дый не прадбачыцца. Да яе дапускаюцца толькі высокакваліфікаваныя спецыялісты, адданыя дзяржаве, здольныя на ўзроўні інтуіцыі прадбачыць і апярэджваць чарговыя зігзагі генеральнай лініі. Мінулым яны не жывуць, бо на яго аналіз не застаецца ні часу, ні сіл. Вось і давялося мне ўзяць ініцыятыву ва ўласныя рукі.

Працей за ўсё падвесці вынікі з дапамогай пошукавіка «самай салíднай газеты» краіны. Вынікі пошуку адлюстраваны ў таблiцы. Яны апынуліся чаканымі. Калі за 2017 год у «Советской Белоруссии» было апублікавана 59 артыкулаў, якія змяшчаюць фразеалагізм «разняволенне дзелавой ініцыятывы», дык за першую палову 2018-га — толькі 7! Прычым, чатыры з сямі — у студзені. Апошні ж раз артыкул з такім папулярным летась фразеалагізмам быў апублікавана 26 красавіка.

Вікіпедыя вызначае моду як сукупнасць звычак, каштоўнасцяў і густаў, прынятых у пэўным асяроддзі ў пэўны час. У канцы мінулага года на верхніх паверхах уладнай вертыкалі ў модзе былі размовы пра разняволенне дзелавой ініцыятывы. Тон, натуральна, задаваў АП. Сваё бачанне праблемы ён, у прыватнасці, выклаў 11 красавіка падчас рабочай паездкі ў Гомельскую вобласць: «У бліжэйшы час мы прымем рэвалюцыйныя рашэнні па прадпрымальніцтву, бізнесу — па разняволенні бізнесу. <...> Прыйшоў — заяву пакінуў, што хочаш займацца гэтай справай, у падатковай зарэгістраваўся ды пайшоў працаваць. Пажарныя, санстанцыя — усё да мінімуму будзе скарочана».

Рэвалюцыйныя рашэнні былі прынятыя, а як наконт рэвалюцыйных вынікаў? Колькасць суб'ектаў гаспадарання на 1 ліпеня ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года павялічылася ў Беларусі на 1,6%, а колькасць індывідуальных прадпрымальнікаў скарацілася на 0,3%. Ці можна такую статыстыку лічыць рэвалюцыйнай? Не ўпэўнены, аднак і адкрыта правальнай назваць яе нельга.

Святое месца пустым не бывае

«Мода не проста робіць жанчын прыгожымі, яна дае ім упэўненасць у сабе», — сцвярджае французскі мадэльер Іў Сэн-Ларан. А як наконт палітыкаў? Палітыка — царства мужчын, тым не менш прытрымліванне палітычнай моды таксама спрыяе павышэнню ўпэўненасці ў сабе прадстаўнікоў моцнага полу (у выпадку Беларусі гаворку пра палітыка варта весці ў адзіночным ліку).

Выхад з моды публічных разваг на тэму «разняволення дзелавой актыўнасці» — працэс натуральны. Палохацца яго не варта, бо ў палітыцы святое месца пустым не бывае. Але што прыйдзе на змену «разняволенню»? Тут могуць быць розныя варыянты. Не выключана, што падказку мы можам знайсці ў прэс-рэлізе «Нарады па пытаннях сацыяльна-прававых гарантый дзяржслужачых і павышэння прэстыжу дзяржслужбы» ад 26 ліпеня.

Ключавыя словы прэс-рэлізу — назоўнік «ўжэстачэнне» і прыметнік «жэстачайшы». Абмяжуюся адным прыкладам: «Но люди и общество должны видеть, что президент тем самым предъявляет жесточайшие требования к госслужащим, а за это им полагается это, это и это. За нарушения уходишь с должности, идешь в тюрьму. Люди должны это все понимать. Поэтому сначала требования к госслужащему, которые он должен жесточайшим образом соблюдать и выполнять, а затем коврижки», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Калі меркаваць па дынаміцы артыкулаў у «Советской Белоруссии», якія змяшчаюць слова «жэстачайшы», слова гэта варта прызнаць неалагізмам, які сігналізуе пра чарговую змену адміністрацыйнага вектара. На працягу шасці гадоў артыкулы з яго згадваннем выходзілі з-пад «залатых пёраў» беларускай журналістыкі ў сярэднім не часцей чым тры разы на год. Мода на жорсткасць (галоўным чынам гаворка ідзе пра «жэстачайшыя» патрабаванні, «жэстачайшую» адказнасць і «жэстачайшы» парадак) стартавала ў 2016 годзе і з таго часу разгортваецца па нарастаючай.

Як вядома, у схільнасці да навукова-тэарэтычнай рэфлексіі АП яшчэ ні разу абвінавачаны не быў. Усе лёсавызначальныя для краіны і грамадства рашэнні ён прымае «ідучы ад жыцця», пра што сам неаднаразова і заяўляў. Якія ж на гэты раз прычыны прымусілі яго перайсці ад разняволення дзелавой ініцыятывы да ўзмацнення жорсткасці патрабаванняў, што прад'яўляюцца чыноўнікам?

«Тебя посодют, а ты не воруй!»

…Савецкая мадэль у максімальнай ступені была пабудаваная паводле раздатачнага прынцыпу. Яе рынак функцыянаваў выключна з дадаваннем прыметніка «чорны». Ён паразітаваў на афіцыйным квазірынку і быў яго неад'емным элементам. Такая вось «салодкая парачка»!

Як тут ні прыгадаць героя Андрэя Міронава з кінафільма «Сцеражыся аўтамабіля», які гандляваў з-пад прылаўка імпартнай радыёапаратурай. Знакамітае абвінавачванне цесця: «А ты не крадзі!» варта прызнаць юрыдычна недакладным. Герой Міронава не краў. Ён спекуляваў, што не адмяняла актуальнасці яго бліжэйшай жыццёвай перспектывы — «Тебя посодют».

Перабудова, у тэрміналогіі Бяссонавай, — гэта пераход ад адміністрацыйнай раздачы савецкага ўзору да раздачы ліберальнай. Першае, што пры гэтым кідаецца ў вочы, — гэта пагалоўнае ўкараненне індывідуальных кантрактаў у сферы рэгулявання працоўных адносін. Барацьбу з дармаедамі варта разглядаць у якасці фінальнага акорда на шляху пераходу ад прыватнай працы да службовай.

Службовы кантракт — гэта не прыватны кантракт паміж двума рынкавымі суб'ектамі, дзе яны вызначаюць усе ўмовы самі. Службовы кантракт фіксуе бяспраўнасць прыватнай асобы, а калі апошняя ўсё ж здолее вырвацца з-пад навязаных працоўных адносін, то дзяржава адмаўляецца ад сваіх канстытуцыйных абавязацельстваў перад ёй.

Пераход да ліберальнай раздачы суправаджаўся адмовай ад жорсткага дырэктыўнага планавання зверху, калі кожнаму прадпісвалася, што і як рабіць на сваім працоўным месцы. У выніку самастойнасць ніжніх звёнаў істотна ўзрасла, але пры гэтым адэкватнага зніжэння жадання «парулíць» на верхніх кіраўнічых узроўнях не сфармавалася. «Самая галоўная складанасць гаспадарання, — адзначае Бяссонава, — гэта забяспечыць самастойнасць у рамках адзіных правілаў. Інакш кожны пачынае аптымізаваць лакальна пад сябе»….

Маштабныя праекты ў Беларусі — гэта за рэдкім выключэннем праекты дзяржаўныя. Таму адзіным суб'ектам, які адказвае за іх распрацоўку і рэалізацыю, быў і застаецца чыноўнік. Прынятыя ў канцы 2017 года пакет дакументаў, накіраваны на разняволенне дзелавой ініцыятывы, да іх дачынення не мае. Тут іншая логіка — логіка жорсткага кантролю. Але яна адмаўляецца працаваць, калі ад чыноўніка патрабуецца не выканаў-часць, а здольнасць «вызначаць стратэгічныя задачы і правільна ацэньваць наступствы рашэнняў, што прымаюцца».

Да чаго гэта прыводзіць на практыцы, наглядна прадэманстраваў прыклад з беларускай АЭС. Будаўніцтва першага энергаблока выйшла на завяршальную стадыю, а АП, паводле яго ўласнага прызнання, «да гэтага часу выразна ніхто не далажыў, як станцыя будзе ўбудаваная ў эканоміку краіны».

Сяргей Нікалюк
"Новы час"

САЦЫЯЛЬНАЯ МАДЭЛЬ

ДВОЙКА ЗЬ МІНУСАМ…

Паездка Аляксандра Лукашэнкі ў Аршанскі раён засьведчыла правал чарговага грандыёзнага мадэрнізацыйнага праекту.

А як прыгожа ўсё пачыналася!

21 красавіка 2017 году, выступаючы са штогадовым пасланьнем парлямэнту і беларускаму народу, Лукашэнка даручыў «падняць з руін і попелу ў бліжэйшы час» населеныя пункты Барань, Балбасава і Воршу. Ураду было загадана паказаць, «як у кароткі прамежак часу трэба разьвіваць буйны і вельмі складаны рэгіён», зрабіць Аршанскі раён узорна-паказальным. Каб затым на гэтым прыкладзе распрацаваць плян разьвіцьця іншых тэрыторый Беларусі. Такім чынам, Аршанскі раён павінен быў стаць лякаматывам рэгіянальнага разьвіцьця краіны.

Чаму менавіта Аршанскі раён быў абраны ў гэтай якасьці, Аляксандар Лукашэнка патлумачыў даволі дзіўна:

«Гэта не таму, што я там нарадзіўся. А таму, што там разьмешчана буйная ўстанова, якая ў народзе называецца „турма". І палова людзей, вызваляючыся, застаецца там. Вы разумееце, нікога не хачу пакрыўдзіць, што гэта за людзі. І як там „проста" працаваць».

То бок менавіта для тых, хто выйшаў з турмы, кіраўнік дзяржавы даручыў стварыць лепшыя ўмовы, чым для ўсіх астатніх грамадзян. Такі ў Беларусі прывілеяваны слой насельніцтва, такія прыярытэты.

Ураду было даручана цягам году (запомнім гэта!) істотна палепшыць сытуацыю ў Аршанскім раёне, а да 2020 году ўсе стратныя прадпрыемствы павінны правесьці мадэрнізацыю, стварыць новыя працоўныя месцы, наладзіць эфэктыўную працу і павысіць заробкі. Выконваючы загад, урад у траўні 2017 году правёў адмысловае паседжаньне па гэтым пытаньні, былі вызначаны падыходы па кожным прадпрыемстве. У чэрвені таго ж году ўрадам былі прыняты комплексны плян першачарговых мер па разьвіцьці Аршанскага раёну да 2020 году. Дзеля гэтага былі выдзелены немалыя грошы «ў межах ліміту дырэктыўнага крэдытаваньня, устаноўленага для Банку разьвіцьця», ільготныя працэнты і іншае. Паводле кіраўніка Віцебскай вобласьці Мікалая Шарстнёва, сума датацый дзесяці раёнаў вобласьці роўная суме датацый, якія атрымлівае Аршанскі раён. Лукашэнка паабяцаў рэгулярна асабіста кантраляваць рэалізацыю гэтага праекту.

І вось праз год, 13 жніўня, кіраўнік Беларусі прыехаў у Воршу, каб паглядзець, як гэты населены пункт паводле яго мудрага рашэньня ператвараецца ў горад-сад. Наведаў чатыры прадпрыемствы. І што пабачыў?

Высьветлілася, што практычна ўсе прадпрыемствы раёну — праблемныя.

«Усё было зроблена саматужна, на скорую руку, а значыць, няякасна... Ня зроблена практычна нічога... Пакуль гэта ідыёцкае стаўленьне да майго даручэньня», — заявіў Лукашэнка на месцы.

І ацаніў працу на двойку зь мінусам. На нарадзе 14 жніўня старшыня Камітэту дзяржаўнага кантролю Леанід Анфімаў канстатаваў, што шэраг паказчыкаў у Аршанскім раёне нават ніжэйшыя, чым сярэднеабласныя.

«Ня любіце вы людзей, ня

(працяг на стар. 4)

САЦЫЯЛЬНАЯ МАДЭЛЬ

(пачатак на стар. №3)

любіце вы завод. Калі ўжо робіце тут нейкую паказуху, зрабіце бардзюр, але навошта ў траву класьці асфальт? Гэта што, культура? Вось за гэта чыноўнікаў і ненавідзіць часам народ — за вашы безалабернасьць і бязладзьдзе», — абурыўся ён.

Далей яшчэ цікавей: «Хіба гэта працоўныя месцы?! Вязьніца нейкая! Катаржныя людзі працуюць за 200 даляраў у месяц!» — абурыўся Лукашэнка ўмовамі працы работнікаў.

Што ж рабіць? Беларускі лідэр хутка знайшоў выйсьце: «Міністра сюды накіруем да цябе працаваць. У яго выбар адзін: ці турма, ці сюды». Гаворка ідзе пра міністра прамысловасьці Віталя Ваўка.

Лукашэнка даў даручэньне паставіць на гэты завод станкі з суседняга заводу «Чырвоны барацьбіт». Без кіраўніка дзяржавы дырэктары заводаў да гэтага дадумацца не маглі.

Сытуацыя на іншых прадпрыемствах, якія наведаў Лукашэнка, ня лепшая. Прыехаўшы ў ААТ «Тэхніка сувязі» ў горадзе Барань, ён заявіў: «Я бачу, вы наагул ня думалі над рашэньнем той задачы, якая была пастаўлена».

А потым здарылася ўвогуле нечаканае, якую кіраўнік дзяржавы пракамэнтаваў так:

«Вы не плянавалі, што я зайду ў ваш „туалет"... дзе ніхто ніколі не прыбіраў» (?!).

Вось такі атрымаўся ўзорна-паказальны раён. Хочацца сказаць, паказушны. З асфальтам, які кладуць у траву, з туалетам, які ніхто ніколі не прыбірае. Але ў гэтым ёсьць вялікі сымбалізм. Гэта і ёсьць сапраўдны ўзор беларускай правіцелі пэрыяду кіраваньня нязьменнага прэзыдэнта. Вынік функцыянаваньня беларускай сацыяльнай мадэлі імя Лукашэнкі. Перафразуючы словы вядомага анэкдоту, хочацца сказаць: гэта Радзіма, Аляксандар Рыгоравіч!

Меркаваньні, выказаныя ў блогах, перадаюць погляды саміх аўтараў і не абавязкова адлюстроўваюць пазыцыю рэдакцыі.

Валер Карбалевіч
"Радыё Свабода"

СПРАВА КОРЖЫЧА

«ЗАСТАВИЛИ ОТЖИМАТЬСЯ В ПРОТИВОГАЗАХ»…

На суде по делу о гибели рядового в Печах рассказали, как обращались с солдатами.

На скамье подсудимых трое сержантов — Евгений Барановский, Егор Скуратович и Антон Важевич. Им предъявлено обвинение по ч. 3 ст. 455 УК (Злоупотребление властью, повлекшее тяжкие последствия), ч.ч. 1, 2 ст. 430 (Получение взятки), ч. 1 ст. 205 (Кража). Военнослужащим грозит до 12 лет лишения свободы.

В первый день суда прокурор зачитал обвинение. Некоторые моменты просто шокируют.

По версии следствия, Барановский неоднократно получал взятки от солдат. Мобильники, которые он замечал у солдат, Барановский оставлял себе. Никому об этом не докладывал. «Молодые» вынуждены были просить у него свои мобильные «в аренду». За один сеанс связи Барановскому платили 30-40 рублей, пишет «Наша Ніва».

Александр Коржич также обращался к сержанту и также вынужден был платить.

Платили солдаты сержанту и за возможность сходить в магазин. Здесь налог брался товарами: растворимый кофе «3 в 1», вафли, сигареты, макароны «Роллтон» ... Все это, согласно следствию, шло сержанту Барановскому.

Всего Коржич купил продукты для Барановского на сумму 54 рубля, сообщает TUT.BY. Другие солдаты тоже ходили в магазин для сержанта, покупали ему булочки, семечки, чипсы, шаурму, пиццу. Всего он получил взяток на сумму в 314 рублей 85 копеек.

Одними деньгами не ограничивались. Барановский с еще одним сержантом, Скуратовичем, поднимали солдат и заставляли отжиматься. Таким образом «молодых» наказывали за недостаточно быстрое построение, плохо пришиты воротнички. Иногда парней поднимали и ночью с постели.

Во время отжиманий их нередко заставляли замирать на полусогнутых руках. Однажды за разговоры после команды «отбой» солдат подняли с постели и заставили отжиматься в противогазах. Один из них сначала отказался, но, получив несколько ударов от сержанта, все же начал отжиматься.

А за то, что подчиненный курил в туалете, заставил рядового вычистить унитаз, только перед этим Барановский вымазал его обувным кремом.

Сержант Егор Скуратович также, по версии следствия, брал с солдат продукты за разрешение сходить в магазин, брал деньги. Сдавал в аренду «изъяты» мобильники, заставлял «молодых» отжиматься.

Летом 2017 года Александр Коржич обратился к Барановскому с просьбой оградить его от нарядов и выполнения незаконных требований других сержантов. Сразу он передал обвиняемому 30 рублей, а затем передал еще 35 рублей, потому что Барановский был недоволен тем, что Коржич попал в стационар.

Систематические унижения, отбирания продуктов, формирование мнения о вседозволенности, беззаконности и коррумпированности побудило Коржича совершить акт самоубийства. Александра Коржича сержант бил шесть раз, нанося по 2–3 удара. По версии следствия, все это и привело к самоубийству Александра Коржича.

— Систематические унижения, отбирания продуктов, формирование мнения о вседозволенности, беззаконности и коррумпированности побудило Коржича совершить акт самоубийства. 27 сентября после выписки из госпиталя Коржич проследовал в подвальное помещение, где и повесился, — зачитал обвинение прокурор….

(скарочана)

"Салідарнасць"

СВАБОДА СЛОВА

ПОГРОМ НЕЗАВИСИМЫХ СМИ

Главное событие начала августа — «дело БелТА». Под предлогом несанкционированного подключения к информации главного информационного ресурса государства Следственный комитет провел обыски в офисе интернет-портала TUT.BY и информационного агентства БелаПАН, других ресурсов, в квартирах журналистов. Возбуждено уголовное дело, были задержаны на 1—3 суток больше десятка работников СМИ.

Сам факт воровства информации у БелТА выглядит как дурной анекдот. Зайдите ради интереса на сайт этого агентства (http://www.belta.by). Через две минуты у вас скулы сведет от скуки. Тем не менее, на этом основании власти начали облаву на главные независимые СМИ страны.

Очень сомнительны юридические основания этого дела. Статья 349 Уголовного кодекса Беларуси, которую вменяют журналистам, предполагает «несанкционированный доступ к информации... сопровождающийся нарушением системы защиты». Ее применяют в отношении хакеров, взламывающих компьютерные системы. В данном случае, судя по обнародованной информации, обвиняемые журналисты входили на сайт БелТА по паролям, полученным от коллег, работающих в государственных СМИ…

Операция имеет активное информационное сопровождение. В государственных медиа развернута кампания против независимых СМИ. Следственный комитет подробно описывает все обвинения, в то же время подозреваемые журналисты дали подписку о неразглашении тайны следствия. То есть выслушать версию обвиняемой стороны мы не можем.

Таким образом, не вызывает сомнений, что вся эта кампания носит политический характер, хоть и происходит под видом наказания за киберпреступление. Так ведь и лидеров профсоюза РЭП Геннадия Федынича и Игоря Комлика также судят не за профсоюзную деятельность, а за неуплату налогов. Такое нынче время на дворе.

Важно обратить внимание, что нападение произошло на два крупнейших независимых информационных ресурса. Интернет-портал TUT.BY имеет самое большое в Беларуси количество пользователей. БелаПАН — единственное в стране негосударственное информационное агентство. Такого масштаба репрессий против медиа у нас давно не было.

Каковы причины этого неожиданного «наезда» на независимые СМИ?

С начала года власти не скрывают своей обеспокоенности тем, что они потеряли контроль над белорусским информационным пространством. Государственные СМИ проиграли независимым медиа политическую борьбу в интернете. Белорусское телевидение не выдерживает конкуренции с российскими телеканалами. Поэтому предпринимаются лихорадочные меры, чтобы эту неприятную ситуацию поменять. Зимой Александр Лукашенко поменял трех редакторов главных государственных СМИ. Заблокировали «Хартию». Приняли новый, более жесткий закон о СМИ. Начали преследование гендиректора информационного агентства БелаПАН Алеся Липая. Генеральный прокурор Беларуси Александр Конюк анонсировал введение ответственности за ложную информацию в интернете. И вот новый виток репрессий против «нечестных» журналистов.

Поскольку власти не в состоянии создать эффективную альтернативу независимым СМИ, то они применяют самый простой, привычный и понятный для них способ борьбы с политическими оппонентами — заткнуть им рот. Нужно запугать не только сами негосударственные информационные ресурсы, но и комментаторов в социальных сетях, чтобы все они немного угомонились, спрятались, включили самоцензуру.

В среде политизированной публики доминирует версия, что непосредственным поводом для этой облавы стала фейковая информация о здоровье А. Лукашенко. А это уже покушение на святое. Личная жизнь, здоровье первой особы в Беларуси — сфера сакральная. Сработал политический инстинкт. И хоть бороться с медиа, с журналистами в эпоху интернета — неразумно, нерационально, но здесь многие вещи происходят инстинктивно, на уровне рефлекса. И тут использовали удобный повод: воровали информацию БелТА. Ага, попался, который кусался!

Каковы политические последствия этого погрома? Прежде всего, в очередной раз включен стоп-сигнал процессу условной либерализации. Причем, судя по всему, это не отдельный шаг, а устоявшаяся тенденция. «Дело профсоюза РЕП», «дело Алеся Липая», теперь вот «дело БелТА». Кто следующий? В СМИ появился термин: «азербайджанизация» Беларуси. (В Азербайджане практически придушили независимые СМИ.)

В экспертном сообществе обращают внимание на то, что репрессии против независимых СМИ происходят в момент обострения политического противостояния между Минском и Москвой. А оно, как обычно, сопровождается очередным всплеском информационной войны. Но проблема в том, что белорусские государственные СМИ проигрывают российским медиа, прежде всего, федеральным телеканалам.

Однако политическое руководство Беларуси считает угрозу своей власти со стороны независимых СМИ большей, чем опасность доминирования российских медиа. Отсюда и соответствующие ответные действия.

Репрессии против журналистов вызвали значительный международный резонанс. О событиях в Беларуси сообщили мировые СМИ, обеспокоенность выразили Совет Европы, Верховный представитель ЕС по вопросам внешней политики и политике безопасности Федерика Могерини, посольство США в Минске и т. д. То есть скандал вышел на международный уровень. И он, мягко говоря, не способствовал улучшению отношений между Беларусью и Западом.

То есть одновременно Минск вступил в период напряженных отношений и с Россией, и со странами ЕС и США. Что просто неразумно. Но так бывает, когда инстинкты вытесняют и подменяют политическую целесообразность.

Валерий Карбалевич

Заснавальнік і рэдактар: Гаравы Леанід Антонавіч

Адрас рэдакцыі: 211573, г. Гарадок, вул. Гагарына, д.30Б, кв.16. E-mail: 250318@list.ru Тэл. 8-02139-5-08-52, маб. + 375(29)6723842 (V), Газета выдаецца з сакавіка 1998 г.

Падпісана да друку 30.08.2018 у 18.20 Наклад: 290 асобнікаў. Выдаецца адзін-два разы на месяц на беларускай і расійскай мовах.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў. Друкуецца на абсталяванні аднадумцаў. Распаўсюджваецца бясплатна дабраахвотнікамі.